У Астравецкім раёне ажыццяўляюць знешнеэканамічную дзейнасць больш за 35 суб'ектаў гаспадарання, у тым ліку больш за 20 арганізацый прыватнага бізнесу.

Абарот знешняга гандлю таварамі арганізацый Астравецкага раёна за 2017 год склаў 524,7 млн. долараў ЗША ці 168,8%, без уліку рэспубліканскіх прадпрыемстваў - 2,9 млн. долараў ЗША ці 165,2%.

Асноўны аб'ём экспартных паставак прыпадае на:

- ДЛГУ «Астравецкі лясгас» (ацыліндраваныя вырабы, дранка паліўная, брыкеты, габлюшка і інш.);
- Фермерская гаспадарка «Астравецкае» (мяса індычкі, кансервы з яго і інш.);
- ТАА «СовтДрэў» (драўляная тара - паддоны);
- ТАА «Белтрос» (тросавыя прывады, запчасткі і інш.);
- ПВУП «ХольцСэрвісТранс» (лесаматэрыялы);
- ЗП «Тэхнапласт» (упакоўка для кандытарскіх вырабаў і харчовых тавараў з плёнкі палістырольнай);
- ДП «Астравецкі рамонтна-вытворчы ўчастак» (лесаматэрыялы);
- ПГВУП «ГудагайЛесПрам» (лесаматэрыялы);
- ПГВУП «КравтДрэў» (лесаматэрыялы).

Прадукцыя прадпрыемстваў Астравецкага раёна экспартуецца на рынкі больш за 10 дзяржаў. Экспарт ажыццяўляецца ў Літву, Германію, Расію, Латвію, Польшчу, Швецыю, Бельгію, Данію, Грузію, Італію, Іспанію, Венгрыю і інш.

Імпарт тавараў у цэлым па раёне ў 2017 годзе ў параўнанні з папярэднім годам павялічыўся амаль у 1,7 разы і склаў 523,0 млн. долараў ЗША. Найбольшую ўдзельную вагу ў імпарце тавараў займае РУП «Беларуская АЭС», на долю якога прыпадае больш за 90%.

Акрамя рэалізацыі тавараў у Астравецкім раёне за 2017 год аказана паслуг на суму 17,7 млн. долараў ЗША, тэмп росту 120,5%, у тым ліку без уліку рэспубліканскіх прадпрыемстваў - 3,8 млн. долараў ЗША ці 122,8%.

Найбольшую ўдзельную вагу ў экспарце складаюць будаўнічыя паслугі, груза-і пасажыраперавозкі, турыстычныя паслугі. Асноўная краіна-экспарцёр Расія.